**Библиографические ссылки:**

1. Западные окраины Российской империи. М.: Новое литературное обозрение, 2006. 608 с.
2. Витте С.Ю. Воспоминания. Царствование Николая II. Берлин: Слово, 1922. Т. 1. 571 с.
3. Гурко В.И. Черты и силуэты прошлого. М.: Новое литературное обозрение, 2000. 810 с.
4. Осоргин М.Н. Воспоминания. М.: Российский Архив, 2009. 850 с.
5. Князь Петр Дмитриевич Святополк-Мирский, Виленский, Ковенский и Гродненский генерал-губернатор. // Виленский календарь. Вильна. Б.и., 1903. С. 167 – 176.
6. Думин С. В., Гребельский П. Х. Князья Святополк-Мирские и дворяне Мирские // Дворянские роды Российской империи. М.: Ликоминвест, 1995. Т. 2. 264 с.
7. Российский государственный исторический архив (РГИА), Ф. 560. Оп. 26. Д. 352.
8. Андреев Д.А. Борьба ревнителей: просветительские альтернативы в начале царствования Николая II. // Вестник ПСТГУ II: История. История Русской Православной Церкви. 2012. Вып. 1 (44). С. 58–74.
9. Устав Общества ревнителей русского исторического просвещения в память императора Александра III. СПб.: Типография А.С. Суворина, 1895. 18 с.
10. Государственный архив Российской Федерации (ГАРФ). Ф. 1729. Оп. 1. Д. 223.
11. Лавринец П.М. Русская литература Литвы (XIX – первая половина XX века). Вильнюс: Вильнюсский университет, 1999. 192 с.
12. Северо-западный край.1903. 12 марта. № 109.
13. Сборник документов Музея графа М. Н. Муравьева. Т. 1 / Сост. А. Белецкий. Вильна: О-во ревнителей рус. ист. просвещения в память имп. Александра III, 1906. 233 с.
14. Булахов М. Г. Евфимий Федорович Карский: Жизнь, научная и общественная деятельность. Минск: Издательство БГУ, 1981. 272 с.
15. Отделы Императорского Русского географического общества. // Энциклопедический словарь Брокгауза и Ефрона. СПб.: Типо-Литография И.А. Ефрона, 1897. Т. XXII. 480 с.
16. Лиходедов В., Улитенок Г. В поисках утраченного: из истории Северо-Западного отдела Русского географического общества. [Электронный ресурс]. URL: http://sb.by›articles/svet-istiny-i-znaniy.html (дата обращения: 20.10.2019)
17. ГАРФ. Ф.1729. Оп. 1. Д. 982.
18. Северо-западный край. 1903. 31 января. № 76.
19. Долбилов М.Д. Превратности кириллизации: запрет латиницы и бюрократическая русификация литовцев в Виленском генерал-губернаторстве 1864 – 1882 гг. // Ab Imperio. 2005. № 2. С. 255 – 296.
20. Корнилов И. Русское дело в Северо-Западном крае. Материалы для истории Виленского учебного округа преимущественно в муравьевскую эпоху. СПб.: Тип. А.П. Лопухина, 1901. 420 с.
21. Эйдинтас А., Бумблаускас А., Кулакаускас А., Тамошайтис М. История Литвы. Вильнюс: Eugrimas, 2013. 318 с.
22. ГАРФ. Ф. 1729. Оп. 1. Д. 241.
23. ГАРФ. Ф. 1729. Оп. 1. Д. 238.
24. РГИА. Ф. 1284. Оп. 190. Д. 83 г.
25. Северо-западный край. 1904. 14 мая. № 455.
26. Корнилович Э.А. Святополк-Мирские. Хранители чести. Минск: ФУАинформ, 2012. 104 с.

УДК 373.5-055.1(476-25)(091)„18“(093.3)

# МІНСКАЯ МУЖЧЫНСКАЯ ГІМНАЗІЯ СЯРЭДЗІНЫ XIX СТ. ВА ЎСПАМІНАХ ТАДЭВУША КОРЗАНА

**В.С. Макарэвіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр.Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь; makarevich.bsu.79@gmail.com*

Як крыніца па гісторыі Мінскай мужчынскай гімназіі аналізуюцца ўспаміны вядомага гісторыка Т. Корзана. Адлюстравана насычанасць крыніцы інфармацыяй і яе значэнне для даслелавання як гісторыі адукацыі ў Беларусі ў сярэдзіне ХІХ ст., так і непасрэдна для вывучэння гісторыі Мінскай мужчынскай гісторыі. Вызначана месца ўспамінаў Т. Корзана ў комплексе гістарычных крыніц па гісторыі Мінскай мужчынскай гімназіі.

***Ключавыя словы:*** Мінская мужчынская гімназія; мемуарыстыка Беларусі; успаміны; крыніцазнаўства; Тадэвуш Корзан.

## МИНСКАЯ МУЖСКАЯ ГИМНАЗИЯ СЕРЕДИНЫ XIX В. В ВОСПОМИНАНИЯХ ТАДЕУША КОРЗОНА

**В. С. Макаревич**

*Белорусский государственный университет,*
*пр.Независимости, 4, 220030, г.Минск, Беларусь; makarevich.bsu.79@gmail.com*

Как источник по истории Минской мужской гимназии анализируются воспоминания известного историка Т. Корзона. Показана наполненность источника информацией и его значение для исследования как истории образования в Беларуси в середине XIX в., так и непосредственно для изучения истории Минской мужской гимназии. Определено место воспоминаний Т. Корзона в комплексе исторических источников по истории Минской мужской гимназии.

***Ключевые слова:*** Минская мужская гимназия; мемуаристика Беларусі; воспоминания; источниковедение; Тадеуш Корзон.

## MINSK MEN'S GYMNASIUM FROM THE MIDDLE OF 19th CENTURY IN TADEUSZ KORZON'S MEMOIRS

**V. Makarevich**

*Belarusian State University, Niezavisimosti Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus,*
makarevich.bsu.79@gmail.com

As a source for the researchers of the history of Minsk men's gymnasium the memoirs of the famous historian T. Korzon is analyzed. Author show's the level of fullness of the source by the information and its significance for studying both the history of education in Belarus in the middle of the 19th century and directly for studying the history of the Minsk men's gymnasium. The place of memoirs of T. Korzon among others sources of the complex of historical sources concerning the history of the Minsk men's gymnasium is also analyzed.

***Keywords:*** Minsk men's gymnasium; memoirs of Belarus; memoirs; source study; Tadeusz Korzon.

Мемуары з'яўляецца вельмі каштоўным відам гістарычных крыніц асабістага паходжання, які дазваляе істотным чынам дапоўніць недахопы крыніц афіцыйнага справаводства і заканадаўства ў "асабістаую" інфармацыю – у назіранні і меркаванні канкрэтнага чалавека пра ўбачанае ці перажытае.

У навучальным працэсе і ў навуковай рабоце на кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта БДУ мемуарыстыка займае заўважнае месца. Для студэнтаў, якія спецыялізуюцца па кафедры, чытаецца спецыяльная дысцыпліна "Грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя працэсы ў Беларусі ў канцы XVIII – пач. ХХ ст. паводле мемуарнай літаратуры і крыніц асабістага паходжання". У аснову спецкурса пакладзена тэарэтычная і практычная падрыхтоўка студэнтаў да працы з мемуарнай літаратурай і яе выкарыстання ў даследчай рабоце. Многія выкладчыкі і навуковыя супрацоўнікі кафедры выкарыстоўваюць мемуарную літаратуру ў сваіх навуковых даследаваннях [2; 3] і ў выкладчыцкай дзейнасці [10; 8], у тым ліку ўводзячы у навуковае выкарыстанне і вучэбны працэс новыя мемуарныя крыніцы [8]. Адной з такіх крыніц, вельмі каштоўнай для вывучэння гісторыі адукацыі і краязнаўства Мінска сярэдзіны ХІХ ст., з'яўляюцца ўспаміны вядомага гісторыка Тадэвуша Корзана "Мінск у сярэдзіне ХІХ ст." [4; 12] У гэтых мемуарах даволі падрабязна апавядаецца штодзённае жыццё Мінскай гімназіі вачыма яе былога вучня. Гэта крыніца вельмі істотна дапаўняе комплекс крыніц, якія адносяцца да гісторыі Мінскай гімназіі.

Мінская гімназія была арганізавана ў 1803 г., на базе мінскага губернскага вучылішча, якое ўзнікла ў выніку рэарганізацыі паезуіцкай школы. У сваю чаргу школа ўзнікла ў 1793 г., пасля таго як Мінск увайшоў у склад Расійскай імперыі. Да гэтага установа была абласной (польск. wydziałowej) свецкай школай, якая падпарадкоўвалася Эдукацыйнай камісіі Рэчы Паспалітай. У сваю чаргу была ўтворана яшчэ ў 1773 г. на базе езуіцкай школы пасля скасавання у тым жа ж годзе ордэна езуітаў. [1, С.3-5] Першапачаткова гімназія размяшчалася ў будынку той жа ж езуіцкай школы – у Верхнім горадзе на Саборнай плошчы, але, ў сувязі з рашэннем пераабсталяваць будынак былой езуіцкай школы пад дом губернатара, гімназія была перамешчана ў карпусы былога базыльянскага кляштара.[ 1, С.3-5]

Гімназія была адным з месцаў дзе была канцэнтравана прадстаўлена мінская інтэлігенцыя -- яе выкладчыкі, але таксама і вучні, многія з якіх ужо ў сценах гімназіі праяўлялі не толькі прагу да навукі, але і грамадскую актыўнасць. У 1819-1822 гг, калі ў Вільні існавалі таварыствы філаматаў і філарэтаў, тут таксама дзейнічала моладзевае тайнае таварыства. Вельмі актыўнымі былі вучні і выкладчыкі гімназіі і ў час бурлівых падзей 1860-х гг.

Гімназія перажыла некалькі адрозных этапаў існавання ў XIX ст. і змянялася ў адпаведнасці з тым, як змяняліся накірункі грамадска-палітычнага жыцця і палітыкі імперскіх уладаў ў Беларусі. У 1844 г. гімназія пераехала ў новы будынак пабудаваны па праекту архітэктара К. Хрышчановіча на рагу вуліц Захар'еўскай (суч. пр. Незалежнасці) і Францысканскай (пазней Губернатарская, суч. вул. Леніна), цэнтральнай тады вуліцы горада.

Сярод выбітных выпускнікоў гімназіі можна узгадаць Т.Зана, С.Манюшку, Ф. Чапялінскага, В.Спасовіча, К.Ельскага, Б.Дыбоўскага, І.Неслухоўскага, А.Лявіцкага, братоў Луцкевічаў і некалькі дзясяткаў іншых літаратараў, грамадскіх дзеячаў, выдатных навукоўцаў. У спіс выбітных вучоных, грамадскіх дзеячаў, чый шлях у інтэлектуальнае жыццё пачынаўся з Мінскай гімназіі, упісана і імя вядомага гісторыка Тадэвуша Корзана. Яго ўспаміны пра Мінск і Мінскую мужчынскую гімназію ахопліваюць перыяд 1840-50-х гг.

У перыяд, калі гімназію заканчваў Т.Корзан – канец 1850-х гг., у ёй вучылася да 600 вучняў – выхадцы пераважна са шляхты, большасць з дробнай, але таксама і мяшчане, дзеці чыноўнікаў. Паводле канфесійнай ці рэлігійнай прыналежнасці вучні ў асноўным былі каталікамі, часткова праваслаўнымі, але былі і мусульмане з беларускіх татар і іўдзеі. У час паўстання 1863-64 гг. многія навучэнцы былі адлічаны, трапілі пад рэпрэсіі, ці былі пад арыштам. [5] Рэпрэсіі закранулі і выкладчыцкі склад гімназіі, які вельмі істотна змяніўся ў сярэдзіне 1860-х гг. Была зменшана колькасць і навучэнцаў гімназіі.

Пасля Першай сусветнай вайны ў будынку гімназіі размяшчалася школа. У гады Вялікай Айчыннай вайны будынак быў пашкоджаны, але не на столькі, каб немагчымай была яго адбудова. Але, у пасляваенны перыяд планавалася расшырэнне вул. Леніна, а будынак стаяў якраз па яе сярэдзіне, таму яго вырашылі знесці. На яго месцы зараз бульвар насупраць дамоў 9 і 11 па вуліцы Леніна.

Асноўны масіў крыніц па гісторыі мінскай гімназіі ўтвараюць дакументы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, якія адкладаліся ў фондзе гімназіі. [10] Фонд ўтрымлівае 541 справу – цыркуляры папячыцеля навучальнай акругі, пратаколы пасяджэнняў педсаветаў, праграмы і вучэбныя планы, справаздачы, ведамасці аб паспяховасці, копіі атэстатаў, пісьмовыя работы вучняў, дакументы на паступленне, фармулярныя спісы і шэраг іншых. Дакументы ахопліваюць перыяд з 1846 па 1920 г.

Акрамя архіўных, важнымі крініцамі па гісторыі мінскай гімназіі з'яўляюцца мемуары. Гімназія, яе вучні і выкладчыкі не аднойчы траплялі на старонкі эгадакументаў. Гэта ўспаміны выкладчыка Ф. Шаблоўскага выдадзеныя С. Кавалеўскай [14], дзе вельмі дэталёва апісваецца жыццё гімназіі сярэдзіны XIX ст., некалькі абзацаў успамінаў Антона Луцкевіча пра яго з братам навучанне у Мінскай гімназіі. [6, С.171] Успаміны ж Т. Корзана – адна з найбольш цікавых і вельмі насычаных інфармацыяй крыніц. Ахопліваюць той жа ж перыяд, што і ўспаміны Ф. Шаблоўскага, якога, дарэчы, Т. Корзан таксама узгадвае. [4]

Тадэвуш Корзан (1839–1918), гісторык, юрыст, адзін з найбольш вядомых польскіх даследчыкаў канца XIX – пачатку XX ст. Нарадзіўся ў Мінску 9 лістапада 1839 г. у сям'і шляхціца, губернскага сакратара Адама Корзана, і Генрыеты з Лавушынскіх. Навучаўся ў Мінскай гімназіі, пасля на юрыдычным факультэце Маскоўскага ўніверсітэта (1855–1859). Адмовіўся ад прапановы далейшага навучання на прафесара права і пераехаў у Коўна, дзе настаўнічаў ў гімназіі (1859–1861), нядоўга працаваў у губернскім камітэце па справах сялянства. У 1861–1862 гг. браў удзел у маніфестацыях і жалобных набажэнствах, якія былі прадвеснікамі паўстання 1863 г. У 1862 г. быў арыштаваны і сасланы ва Уфу, пазней пераведзены ў Арэнбург. У 1867 г. змог выехаць у Літву, але паліцыя змусіла яго перасяліцца ў Пётркуў Трыбунальскі ў Польшчы, дзе ён правёў два гады пад наглядам паліцыі. Да ўказа 1883 г. Т. Корзану было забаронена ўязджаць ў Беларусь і іншыя заходнія губерні імперыі. У 1869 г. змог перасяліцца ў Варшаву, дзе было прайсцей знайці працу чалавеку з універсітэцкай адукацыяй.

У Варшаве Т. Корзан зарабляў як прыватны настаўнік рускай мовы, займаўся перакладамі, нейкі час працаваў чыноўнікам на чыгунцы. У 1876–1886 гг. выкладаў у гандлёвай школе імя Кронэнберга. Зарабляў таксама артыкуламі. З 1872 г. пачаў актыўна выдавацца і хутка зарабіў сабе імя выдатнага гісторыка. З 80-х гг. XIX ст. ужо як прызнаны гісторык часта ўдзельнічаў у навуковых кангрэсах у Еўропе. Прысвячаў шмат увагі развіццю школы, падрыхтаваў некалькі падручнікаў. У пачатку 1880-х гг. выдаў адну з найбольш вядомых сваіх прац – "Гісторыя Польшчы ў часы Станіслава Аўгуста" [13], якая не страціла сваёй актуальнасці. З улікам таго, што многія пісьмовыя крыніцы, якімі карыстаўся Корзан, згарэлі ў 1944 г. у зруйнаванай нацыстамі Варшаве, яго праца набыла дакументальны характар. У 90-я гг. XIX – пачатку XX ст. Т. Корзан шмат публікаваўся, удзельнічаў ў палеміках і кангрэсах. З 1897 г. працаваў бібліятэкарам у прыватнай бібліятэцы ардынацыі Замойскіх у Блакітным палацы ў Варшаве. У 1903 г. удзельнічаў у працы I Міжнароднага кангрэса гістарычных навук у Рыме, дзе прадставіў сваё вызначэнне гісторыі як навукі аб цывілізацыі. У палітычных поглядах Корзану бліжэй была пазіцыя нацыянальна-дэмакратычнай партыі Р. Дмоўскага. Друкаваўся ў партыйнай перыёдыцы. Пасля рэвалюцыі 1905–1907 гг., якую успрыняў даволі крытычна, і смерці жонкі -- Ядвігі з роду Кульвецяў (1905), друкаваўся меней, пісаў рэцэнзіі. Шмат увагі надаваў успамінам, выданню прац і артыкулаў, якія ў 1915 г. былі выдадзены ў 4 тамах: "Адкрытыя лісты: Прамовы. Даследаванні. Разгляды" ("Listy otwarte: Mowy. Rozprawy. Rozbiory. Warszawa, 1915.").

У 1906 г. Т. Корзан напісаў ўспаміны пра свае дзіцячыя гады ў Мінску, якія ў 1908 г. надрукаваў у часопісе "Kalendarz Miński" ("Мінскі каляндар"). [12] Значная частка успамінаў тычыцца перыяду навучання ў мінскай гімназіі. У наступныя гады дапоўніў ўспаміны раздзеламі пра навучанне ў Маскве, працу ў Коўна, выгнанне, жыццё ў Пётркаве Трыбунальскім. Выдаў усе успаміны ў адным выданні ў 1912 г. у Кракаве пад назвай "Мае дагістарычныя ўспаміны" ("Mój pamiętnik przedhistoryczny"). Па прычыне хваробы ў перадваенныя гады абмежаваў выкладчыцкую дзейнасць. Першая сусветная вайна застала яго ў нямецкім тады Сопаце, адкуль гісторык вакольнымі шляхамі, праз Швецыю і Фінляндыю дабіраўся да Варшавы, дзе праз некалькі гадоў -- 18 сакавіка 1918 г. памёр.

Успаміны Т. Корзана – крыніца створаная гісторыкам. Для краязнаўцаў Мінска і гісторыкаў яго ўспаміны з'яўляюцца цэнным скарбам, паколькі не надта многа з падобнай спадчыны з сярэдзіны XIX ст. мае сталіца Беларусі. Аўтар красамоўна, у некаторых сюжэтах падрабязна малюе вобраз Мінска вось ўжо амаль 170-гадовай даўніны. Чытач адпраўляецца ў падарожжа па мінскіх вуліцах спыняючыся каля кожнага значнага помніка, касцёла, звычайнага мінскага дворыка, часам заходзячы ўнутр, слухаючы людзей, разумеючы іх, адчуваючы спецыфіку мовы etc. Чытач даведваецца падрабязнасці паўсядзённага жыцця, паводзінаў шляхты, расійскіх службоўцаў, настаўнікаў гімназіі, адчувае Мінск іншай эпохі, эпохі сярэдзіны XIX ст., якая яшчэ не разарвала канчаткова сувязь з мінулым Рэчы Паспалітай, горад, які як-

бы затрымаўся ў развітанні з ім, з трывогай углядаючыся ў непазбежную будучыню, якая бязлітасна ўсталёўвала новы парадак рэчаў.

Надзвычай падрабязна аўтар спыняецца на апісанні навучальнага працэсу у Мінскай гімназіі ў 1850-я гг. Апісвае выгляд і настроі выкладчыкаў і гіназістаў, іх склад, раскazвае пра фармальныя і нефармальныя адносіны паміж вучнямі і педагогамі. Гэта важныя успаміны для краязнаўцаў і людзей, якія цікавяцца гісторыяй Мінска, для прафесійных гісторыкаў па гісторыі адукацыі.

Будучы адарваным ад радзімы ўжо з юнацкіх гадоў, пасля навучання і ссылкі пераехаўшы ў Варшаву, Корзан не адчуў, па меншай меры пра гэта не пісаў, той дылемы нацыянальнага самаакрэслення, якая закранула напрыканцы XIX ст. у Беларусі, Літве і Украіне частку мясцовай польскамоўнай інтэлігенцыі. Яе некаторыя прадстаўнікі спачатку спачувалі, а пасля станавіліся актыўнымі ўдзельнікамі беларускага руху. Гэта В. Іваноўскі, Р. Скірмунт, А. Пашкевіч і многія іншыя. Пэўныя змены адбываліся і ў асяроддзі Т. Корзана. У мемуарах пра студэнцкія гады у Маскве (Mój pamiętnik przedhistoryczny) ён узгадвае, што “польскія” студэнты там, якія былі з тэрыторый былога Вялікага княства Літоўскага выразна падзяляліся на групы: „паводле тонкасцяў сваёй псіхалагічнай спецыфікі” на – “русінскую, ці дакладней беларускую, і жмудзінскую” -- адным з крытэрыяў чаго быў і іх акцэнт.[7, С.113] Гэта дазваляе меркаваць, што ў 50-я гг. XIX ст. спецыфіка мовы і самасвядомасці звязвала моладзь больш шчыльна з тым этнаграфічным рэгіёнам, адкуль яны паходзілі, што спрычыньвалася да ўтварэння земляцкіх колаў. Калі улічваць значную папулярнасць сярод тагачаснай студэнцкай моладзі дэмакратычных ідэй, можна ўбачыць у гэтым эвалюцыю самасвядомасці ад саслоўнай да этна-нацыянальнай. Пазней, на пераломе стагоддзяў, гэтыя людзі будуць аб’ядноўвацца не вакол свайго саслоўнага паходжання, ідэалізуючы шляхецкую Рэч Паспалітую, а вакол новых нацыянальных праектаў.

У час станаўлення сучасных нацыянальных рухау ў канцы XIX ст. Т. Корзан быў ужо чалавекам у даволі паважаным узросце, чалавекам адарваным ад радзімы і ўцягнутым у віхуру спраў свайго варшаўскага жыцця. Тым не менш, пішучы на сёмым дзясятку жыцця ўспаміны пра Мінск, ён не выказвае ніякай пагарды да беларушчыны, што праўда, успрымае яе толькі як арганічную, не самадастатковую, але разам з тым і цэнную для яго частку рэчаіснасці, як частку спадчыны і мінуўшчыны Рэчы Паспалітай. Беларуская мова для яго не чужая, ён цытуе некаторыя выразы мінчан, скорагаворкі маленькіх навучэнцаў-шляхцюкоў, што прыехалі па навуку ў Мінск, у мове якіх чытач чуе мяшанне польскіх і беларускіх слоў. Гэта вельмі цікавыя і ненаўмысга уключаныя цытаванні вельмі каштоўныя для нас, паколькі мала прыкладаў запісанага прамога маўлення гэтай катэгорыі насельніцтва сярэдзіны XIX ст. Белурускія словы і тэрміны можна сустрэць і ў мове самаго Корзана. У асяроддзі дробнай і сярэднезаможнай шляхты беларуская мова функцыянавала. Гэта падцвярджаецца і шэрагам іншых крыніц. [7] Беларускія сяляне для Т. Корзана не чужыя, як сяляне замежжа, яны свае – “сяляне нашыя”. Аднак, разам з тым, не варта шукаць чагосьці большага, патрыятычнага для беларусаў у гэтых успамінах, бо час, калі фармаваўся яго светапогляд, быў яшчэ часам ўспрыняцця шляхтаю сваёй тоеснасці праз прызму традыцый колішняй шляхецкай Рэчы Паспалітай, быў часам яшчэ існуючага т.зв. “польскага шляхецкага народу”, для якога былі важны не этна-нацыянальныя, а дзяржаўна-палітычныя ідэалы Рэчы Паспалітай. Што праўда, эпоха рамантызму і “нацянальная эмансіпацыя” простага люду ўжо паволі пачыналі трансфармацыі і ў гэтай сферы.

Пра дзіцячыя гады Т. Корзан узгадвае, што ў навакольных дварах было поўна дзяцей, якія вучыліся ў прыватных настаўнікаў, альбо ў дзяржаўных школах. Піша пра жыццё навучэнцаў у праватных пансіёнах, якіх было многа у Мінску. Кепскі матэрыяльны стан навучэнцаў, іх беднае харчаванне, кошты пражывання, спосабы навучання і пакарання – пра гэта можна знайсці ва успамінах Т. Корзана [12, S.44-50].

Падрастаючы Т. Корзан пачаў шукаць таварыства гімназічных вучняў. На другім баку завулка здымалі жыллё каля 15-ці вучняў з гувернёрамі. Ён соўгаўся паміж імі каб даведацца як яны вучацца і як ім чытаюць лекцыі. Узгадвае кульгавага

Мейштовіча, які не надта ўдала ладзіў з лацінаю; сябры прыгаворвалі яму – як сам піша Корзан -- па-беларуску: "Hic, haec, hoc (лац. -- гэты, гэтая, гэта), кладзіся васьпань на пянёк, за такія збродні, спушчай васьпан сподні!" (у арыгінале лацінкаю: Hic, haec, hoc, Kladzi sia Waspan na pieniok, za takije zbrodni, spuszczaj Waspan spodni!) Гувернёр гімназістаў біў ляніўцаў па руках лінейкай і круціў вушы. Бываў Корзан таксама сведкам і радасці гімназістаў, што пражывалі ў пансіёне, калі гаспадыня на вячэру падавала "мніхі" (з пол. -- манахі), іх любімую і простую страву, якая складалася з танных абаранкаў, што заліваліся кіпенем з невялікай колькасцю масла [4, С.133].

Корзан сакавіта апісвае і забавы гімназістаў у пансіёне. Апісвае таксама спосабы падрыхтоўкі, што прымяняў яго бацька, каб адправіць сына адразу у трэці клас гімназіі, замяніўшы першы і другі год навучання рэпетытарамі. Летам 1850 г. аўтар успамінаў быў страшэнна перапуджаны, бо павінен быў пайсці адразу ў 3-ці клас. Успамінае як адбывалася яго самападрыхтоўка, як у яго прымалі экзамен, якім быў яго першы дзень у гімназіі. У 3-м класе Корзан быў наймалодшым па ўзросце, яму было толькі 11 год, у той час як большасць мелі па 13–14 гадоў; было і некалькі старэйшых, амаль дваццацігадовых -- сядзелі на апошняй парце і забаўляліся. Успамінае вучняў з прозвішчамі Юрага, Прорвіч. Апошні -- адзіны праваслаўны, але які гаварыў па-польску, Карыцкі – татарын- мусульманін. Ва успамінах можна знайсці таксама сакавітыя апісанні гімназічнай штодзённасці – заняткаў, вопраткі, момантаў, якія характарызуюць мову гімназістаў, перапынкі, пакаранні вучняў, арганізацыю рассадкі вучняў у класе, нават падрабязнасці арганізацыі санітарных патрэб, апісвае выкладчыкаў, даволі жорсткія спосабы навучання, змест і якасць падручнікаў па якіх вучыліся тагачасныя гімназісты. Успамінае пра візіт віленскага генерал-губернатара І. Бібікава ў гімназію ў 1854-м годзе, пасля якога быў зменены дырэктар, пра цэнзуру і барацьбу новага дырэктара Дзясніцкага з свавольствамі вучняў, з забаронай чытання польскіх кніжак у гімназіі, пра здарэнні і пакаранні, прычынай якіх сталі знойдзеныя антыўрадавыя вершы і парэзаны партрэт Мікалая І. Піша таксама і пра прагу да самаадукацыі часткі вучняў, пра радасці і трывогі гімназічнага жыцця ва ўмовах новых парадкаў, пра абмен кнігамі, чытанне твораў Сыракомлі і некаторыя іншы моманты штодзённасці гімназічнага жыцця – усё гэта можна знайсці звярнуўшыся як да арыгінальнага тэкста на польскай мове, ці яго беларускага перакладу. [4, С.138-155] Няма сумненняў, што успаміны Т. Корзана з'яўляюцца цудоўнай і ўсё яшчэ недаацэненай крыніцай па гісторыі адукацыі ў Беларусі ў XIX ст.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Адо Н. Краткий исторический очерк Минской мужской гимназии / сост. Директор гимназии Н. Адо. -- Минск, 1903. – Ч.1-2, 1903.
2. Бурачонак А.В. Крыніцы па праблеме развіцця прамысловага прадпрымальніцтва ў фабрычна-заводскай сферы вытворчасці Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. / А. В. Бурачонак // Историческое наследие Беларуси: выявление, сохранение и изучение : материалы Международной научной конференции, посвященной 90-летию Государственной архивной службы Республики Беларусь, 85-летию Национального архива Республики Беларусь и 20-летию кафедры источниковедения БГУ (г. Минск, 17–18 мая 2012 г.) : в 2 ч. / [редколлегия: В. И. Адамушко и др.]. – Минск, 2013. – Ч. 1. – С. 133—141.
3. Каханоўскі А.Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.) / А. Г. Каханоўскі. - Мінск : БДУ, 2013. - 333, [2] с.
4. Корзан Т. Мінск у сярэдзіне XIX ст. З уласных успамінаў / Т. Корзан // ARCHE, № 3. – 2010. – С. 115-156.
5. Краснянский В.Г. Из истории польского мятежа 1863 года: Минская гимназия в 1861—1865 годах. - Б.м., [1901]. - С. 937—970.
6. Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху / Антон Луцкевіч. - Выд. 2-е, дапоўненае і папраўленае. - Вільня [Вільнюс] : Інстытут беларусістыкі : Беласток, Беларускае гістарычнае таварыства, 2010. - 332 с.
7. Макарэвіч В. Мова шляхты Беларусі ў XIX стагоддзі / Віталь Макарэвіч // Беларускі гістарычны часопіс : навукова-тэарэтычны, навукова-метадычны часопіс / заснавальнікі:

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, РУП "Выдавецтва "Пачатковая школа", Інстытут гісторыі НАНБ, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. – 2012. — № 3. — С. 11—17
8. Макарэвіч В. Тадэвуш Корзан і яго Мінск сярэдзіны XIX ст. / Віталь Макарэвіч // ARCHE, № 3, -- 2010, -- С. 110-114.
9. Маскевіч Г.І. Сацыяльная стратыфікацыя сялянства Беларусі ў 60–90-я гг. XIX ст.: дысертацыя на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук: 07.00.02: абаронена 26.05.11: зацверджана 09.11.11 / Маскевіч Ганна Іванаўна. - Мінск, 2010. - 164 л.
10. Минская гимназия // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 466, д. 541.
11. Страленя Г.А. Деятельность земских начальников на территории Беларуси (конец XIX в. – 1914 г.): диссертация на соискание ученой степени кандидата исторических наук: специальность 07.00.02 Отечественная история / Страленя Анна Анатольевна. - Минск, 2017. - 169 л.
12. Korzon T. Mińsk w połowie XIX wieku : ze wspomnień osobistych / Tadeusz Korzon // Kalendarz Miński na rok przestępny 1908 / -- 2-gi rok wyd. – Mińsk: Nakładem Mińskiego Towarzystwa Dobroczynności, 1908. – 205, [16] с. – S. 44-63.
13. Korzon T. Wewnętrzne dzieje Polski za Stanisława Augusta (1764-1794) : badania historyczne ze stanowiska ekonomicznego i administracyjnego : w 4 t. / T. Korzon. – Kraków : Akad. Umiejętności, 1882–1886.
14. Kowalewska Z. Obrazki mińskie, 1850-1863 / Zofja Kowalewska. – W Wilnie : Nakład Księgarni Józefa Zawadskiego, 1912. –128 с.

УДК 373.5-055.1(476-25)(091)„18“(093.3)

## ЯНКА НАТУСЕВІЧ: НЕВЯДОМЫЯ СТАРОНКІ ЖЫЦЦЯ І ДЗЕЙНАСЦІ

**А.М. Максімчык**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г.Мінск, Беларусь; forest_child@list.ru*

Артыкул прысвечаны малавядомым старонкам біяграфіі і дзейнасці аднаго з лідэраў беларускага нацыянальнага руху на Гродзеншчыне Янкі Натусевіча напрыканцы 1910 – пачатку 1920-х гг. На аснове архіўных дакументаў устаноўлены дата і месца яго нараджэння, перыяд навучання ў гімназіі і ўніверсітэце, факты яго знаходжання і дзейнасці ў Тыфлісе, Берліне, Варшаве. У артыкуле прыводзіцца некалькі раней неапублікаваных дакументаў, якія звязаны з яго ўдзелам у рабоце Каўказскай Краёвай Беларускай Рады, місіі Беларускай Народнай Рэспублікі ў Варшаве. Адлюстравана яго арганізацыйная, грамадска-палітычная і публіцыстычная дзейнасць. Адзначаецца, што ў біяграфіі Я. Натусевіча застаецца яшчэ шмат невядомых старонак.

***Ключавыя словы:*** Янка Натусевіч; беларускі нацыянальны рух; Гарадзенскі Беларускі нацыянальны камітэт; Каўказская Краёвая Беларуская Рада; місія Беларускай Народнай Рэспублікі ў Варшаве.

## UNKNOWN PAGES OF LIFE AND ACTIVITY OF JANKA NATUSEVICH

**A.N. Maksimchik**

*Belarusian State University, Niezavisimosti Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus; forest_child@list.ru*

The article is devoted to little-known pages of the biography and activities of one of the leaders of the Belarusian national movement in the Grodno region of Yanka Natusevich in the late 1910 - early 1920s. On the basis of archival documents, the date and place of his birth, the period of his studies at the gymnasium and the university, the facts of his stay and activities in Tiflis, Berlin, Warsaw are established. The article provides several previously unpublished documents related to his participation in the work of the Caucasian Regional Belorussian Council, the mission of the Belarusian People’s Republic in Warsaw. The article also reflects his organizational, socio-political and journalistic activities. At the same time, there are still many unknown pages in the biography of Y. Natusevich.

***Key words:*** Janka Natusevich; Belarusian national movement; Belarusian National Commettee in Grodno; Caucasian Regional Belorussian; Mission of the Belarusian People’s Republic in Warsaw.

Разгляд гісторыі беларускага нацыянальнага руху праз прызму біяграфій і дзейнасці яго асобных дзеячаў дазваляе прадэманстраваць новыя ракурсы ў гэтым